Невыпадкова думка пра асэнсаванае стаўленне да творчай дзейнасці, пра значнасць у літаратуры фармальна-тэхнічных уменняў і абавязковасць цярплівай апрацоўкі зыходнага матэрыялу чырвонай ніткай праходзіць праз усю творчасць Багдановіча. “Апавяданне аб іконніку і залатару…”, стаўшы сапраўднай падзеяй у беларускай прозе 1910 гадоў, на практыцы прадэманстравала плённасць сфармуляваных яго аўтарам мастацка-тэарэтычных падыходаў. Наватарскі характар твора абумоўлены неардынарнасцю ўзнятай праблемы, арыгінальнасцю прынятых стылёвых рашэнняў, філасофскай глыбінёй у раскрыцці тэмы і бездакорнасцю мастацкай формы.

Трохчастковая кампазіцыя “Апавядання аб іконніку і залатару…” вызначаецца выверанасцю і класічнай уважнасцю: у кароткай інтрадукцыі сцісла абмалёўваюцца месца і час дзеяння, даецца першасная характарыстыка персанажаў; асноўную частку твора складаюць разгорнутыя, ідэйна-насычаныя маналогі іконніка і залатара; заключны абзац “згортвае” дзеянне, лагічна завяршаючы мастацкі аповед. Напісанню твора папярэднічала скрупулёзнае вывучэнне Багдановічам стылістыкі і лексічных асаблівасцей беларускіх рукапісаў і старадрукаў. Багдановіч упершыню ў новай беларускай літаратуры бліскуча выкарыстаў выяўленчыя магчымасці старадаўняй лексікі, не толькі падказаўшы тым самым шлях да ўзбагачэння мастацкага інструментарыя айчыннай прозы, але і выканаўшы яшчэ адну надзвычай значную для станаўлення нацыянальнай літаратуры задачу – творчае ўзнаўленне перарванай у XVIII стагоддзі традыцыі “высокай” пісьмовай кніжнасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, “Апавяданне аб іконніку і залатару…” Багдановіча істотна пашырыла стылёва-жанравыя даляглядыі беларускай прозы пачатку XX стагоддзя і, спалучыўшы мастацкую віртуознасць і тэарэтычную глыбіню, стала выдатным прыкладам рэалізацыі філасофска-эстэтычнага патэнцыялу айчыннай літаратуры. Багдановіч закрануў самыя надзённыя для маладога нацыянальнага пісьменства праблемы, у першую чаргу – неабходнасць выхаду беларускіх аўтараў на еўрапейска-мастацкі ўзровень. “Апавяданне аб іконніку і залатару…” аказала безумоўны ўплыў на станаўленне ў нацыянальнай літаратуры жанру прытчы.

Літаратура:
1. Багдановіч, М. Шыпшына / М. Багдановіч. – Мінск: Юнацтва, 1991. – 238 с.

## МАТЫВАЦЫЯ МЯНУШАК ЖЫХАРОЎ ЛЕПЕЛЬСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Гарбёнак Л.В.,***
*студэнтка 5 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт

Мянушка – гэта прыдуманае імя, у якім адлюстраваны асаблівасці побыту, заняткаў чалавека, яго становішча ў сям’і ці грамадстве. У мянушцы называюцца якасці чалавека як асобы (дужы ён ці кволы, спагадлівы або злы, жорсткі, бедны ці багаты, дзе пасяліўся – на гары, за балотам, да якой жывёліны падобны ці з якой раслінай можа быць параўнаны) [3, с. 106]. Актуальнасць нашага даследавання не выклікае сумнення, паколькі вывучэнне сучасных неафіцыйных найменняў жыхароў Лепельскага раёна Віцебскай вобласці да гэтага часу не праводзілася.

Мэта артыкула – выявіць асаблівасці матывацыі неафіцыйных найменняў жыхароў Лепельскага раёна Віцебскай вобласці.

**Матэрыял і метады.** Працэс збору матэрыялу праходзіў шляхам апытання жыхароў вёсак Зялёны Востраў, Вялікі Поусвіж, Новыя Валосавічы, Старыя Валосавічы, Таронкавічы, Весялова, Грыгаравічы Лепельскага раёна. Усяго было сабрана і прааналізавана 125 адзінак. Выкарыстаны апісальны метад даследавання.

**Вынікі і абмеркаванне.** Сярод усіх найменняў мы вылучылі наступныя семантычныя групы: мянушкі адантрапанімнага характару; найменні, дадзеныя па фізічных якасцях асобы; мянушкі, што характарызуюць псіхічныя якасці чалавека; найменні, дадзеныя па схільнасці да харчовых прадуктаў і напояў; адзінкі, якія ўзніклі ў выніку розных выпадкаў з жыцця.

Характэрна, што самую вялікую па колькасці групу складаюць мянушкі адантрапанімнага характару (66 адзінак са 125, ці 52,8% ад усіх). Сярод іх можна вылучыць наступныя падгрупы: мянушкі, якія ўзніклі ад прозвішча носьбіта; найменні, што паходзяць ад уласнага асабовага імені носьбіта ці яго сваякоў; онімы, дадзеныя па імені па бацьку носьбіта; адзінкі, якія паходзяць ад мянушак сваякоў.

Падгрупа мянушак, дадзеных чалавеку па яго прозвішчы, з’яўляецца самай вялікай па колькасці і ўключае 40 адзінак. Такія найменні ўзніклі рознымі шляхамі: усячэнне фіналі прозвішча без далучэння якіх-небудзь фармантаў, усячэнне фінальнай часткі прозвішча і далучэнне афіксаў, усячэнне фіналі прозвішча і далучэнне канчатка і інш. Напрыклад, *Трубіха* (ад прозвішча Трыбо), *Папчыха* (ад прозвішча Папко), *Падзік* (ад прозвішча Падзікаў). Найбольшая колькасць людзей, што з’яўляюцца носьбітамі мянушак адантрапанімнага характару, належыць да ўзроставага дыяпазону ад 25 да 60 гадоў (45 адзінак з 66 групы, ці 36% ад усіх онімаў адантрапанімнага характару). Найменні, якія ўзніклі ад прозвішча, улас-



Репозиторий ВГУ

нага асабовага імені ці мянушкі, найменш распаўсюджаны сярод людзей ва ўзросце да 20 гадоў (зафіксавана ўсяго 6 адзінак).

Другой па колькасці з'яўляецца група антрапонімаў, што ўзніклі ў выніку розных выпадкаў з жыцця носьбіта (26 адзінак са 125, ці 20,8% ад усіх). Да гэтай групы мы аднеслі мянушкі *Пракурор, Трынаццаты, Нармалёк, Паравоз* (мужчына па імені Мікола носіць гэтую мянушку з дзіцячага ўзросту, ад яе ўтварылася мянушка старэйшай дачкі – *Паравозіха* і малодшай дачкі – *Электрычка), Гоша, Бібік, Падплятанка.* Носьбіты антрапонімаў названай групы маюць узрост ад 25 да 58 гадоў. Найменні такога характару не вельмі папулярныя ў людзей ва ўзросце больш за 60 гадоў.

Трэцяй па колькасці з'яўляецца група мянушак, дадзеных па знешнасці носьбіта (22 адзінкі са 125, ці 17,6% ад усіх). Мянушкі, дадзеныя па росце і целаскладзе, характарызуюць людзей невысокага росту *(Сына, Шыцік, Шкет, Карот),* паўнаватага целаскладу *(Пончык, Кумпяк, Кабан),* худога целаскладу *(Дрында, Дрыня).* Намі выдзелены найменні, што характарызуюць рост і целасклад, асаблівасці частак цела, наяўнасць валасоў і іх колер, вопратку і асаблівасці хады. Узроставы дыяпазон носьбітаў названай групы – ад 17 да 78 гадоў. Аднак людзям рознага ўзросту такія адзінкі ўласцівы не ў аднолькавай ступені: найбольш яны характэрны для асоб узроставай катэгорыі ад 17 да 43 гадоў (18 з 22). Найменш уласцівы антрапонімы, дадзеныя па знешнасці, людзям старэйшым: ад 43 да 78 (3 адзінкі з 22).

Чацвёртую па колькасці групу складаюць онімы, якія апісваюць рысы характару чалавека. У названую групу намі было ўключана 11 антрапонімаў са 125, што складае 8,8% ад усіх. Сярод адзінак, якія апісваюць носьбіта па асаблівасцях паводзін, намі былі зафіксаваны наступныя мянушкі: *Ганс* – хітры мужчына, *Курыца* – хлопец недалёкага розуму, *Страіцель* – мянушку атрымала дзяўчына, якая заўсёды гучна гаворыць (як на будоўлі падчас працы, калі шумяць розныя машыны і прыстасаванні). Мянушкі прааналізаванай групы характарызуюць людзей хітрых, вясёлых, злых, эмацыйных, разумных і неразумных. Як бачна, найменні характарызуюць носьбіта як са станоўчага боку, так і з адмоўнага. Сустракаюцца мянушкі, якія сведчаць пра іранічныя адносіны да іх носьбітаў. Сярод носьбітаў мянушак прааналізаванай групы найбольшую колькасць складаюць людзі ва ўзросце ад 25 да 43 гадоў (9 адзінак з 11).

Пятую групу неафіцыйных найменняў утвараюць адзінкі, дадзеныя па схільнасці да харчовых прадуктаў і напояў. Група ўтрымлівае 2 (ці 1,6% ад усіх) антрапонімы: *Сялёдка* – мужчына вельмі любіць сялёдку, мянушку атрымаў яшчэ у маладым узросце ад сяброў; *Страх* – мужчына мае схільнасць да алкагольных напіткаў ("калі нап'ецца, то становіцца буйным, усім становіцца вельмі страшна ад яго выгляду"). Носьбітамі найменняў гэтай групы з'яўляюцца асобы мужчынскага полу рознага ўзросту (ад 24 да 40 гадоў).

**Заключэнне.** Такім чынам, мянушкі жыхароў Лепельшчыны дастаткова разнастайныя па прыкметах, пакладзеных у іх аснову. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца мянушкі адантрапанімнага характару. Самымі нешматлікімі – адзінкі, дадзеныя па схільнасці да харчовых прадуктаў і напояў, онімы, што апісваюць рысы характару чалавека. Мянушкі ўжываюцца ў дачыненні да асоб ад дваццаціпяці- да шасцідзесяцігадовага ўзросту.

Адны з неафіцыйных найменняў існуюць непрацяглы час і хутка знікаюць, другія – усё жыццё носьбіта, трэція – перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

На Лепельшчыне бытуюць як індывідуальныя мянушкі, што называюць канкрэтнага чалавека, так і групавыя (сямейныя), якія называюць некалькі чалавек (напрыклад, *Бібікі* – так называюць усіх членаў сям'і, *Шпачкі* – ад бацькі мянушка перайшла дзецям і іншым сваякам). Індывідуальныя онімы пераважаюць над сямейнымі па той прычыне, што вылучаюць, характарызуюць, індывідуалізуюць чалавека.


Літаратура:

1. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія 1: Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М.В.Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.
2. Мезенка, Г.М. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М.Мезенка. – Віцебск: Выдавецтва ВДУ імя П.М.Машэрава, 2009. – 254 с.
3. Юрэвіч, У.М. Слова жывое, роднае, гаваркое. [Тэкст]: Дапам. для настаўнікаў / У.М.Юрэвіч. – Мн.: Маст. літ., 1998. – 282 с.


## АСАБЛІВАСЦІ СТРУКТУРЫ СУЧАСНЫХ СЕТКАВЫХ НАЙМЕННЯЎ


***Гугалінская Т.А.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт


Апошняе дзесяцігоддзе адзначылася бурным развіццём сродкаў і спосабаў перадачы інфармацыі. Зараз камунікацыя адбываецца дзякуючы камп'ютарнай тэхніцы, у тым ліку інтэрнэту. Сёння інтэрнэт з'яўляецца неад'емнай часткай культуры грамадства, адным з асноўных элементаў развіцця цывілізацыі. Любы чалавек, заходзячы ў інтэрнэт-прастору, павінен стварыць сабе імя для віртуальных зносін. Узнікненне камп'ютарных імён абумоўлена неабходнасцю ідэнтыфікацыі карыстальніка ў межах адной віртуальнай прасторы – блога, чата, канферэнцыі. Калі раней чалавеку трэба было "адпавядаць" свайму

Рэпазіторый ВДУ